Бн836

1975

# ПЕСНІ НА СЛОВЫ А. РУСАКА

Бн 83

МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ

# Мастацкай самадзейнасці

Сягоння, напэўна, немагчыма ўявіць сабе нашай песеннай культуры без песні «Бывайце здаровы». Па ёй жа пазнаюць беларускае мастацтва і за межамі нашай рэспублікі. А нарадзілася яна так. Верш «Бывайце здаровы» быў запісаны некім як фальклорны твор і ўпершыню надрукаваны ў навагоднім нумары «Праўды» ў 1937 годзе як беларуская народная песня. Неўзабаве ён быў змешчаны ў рэспубліканскім друку ўжо ў арыгінале. Амаль адначасова паявілася і мелодыя песні І. Любана, напісаная на гэты тэкст, якая адразу пайшла ў народ. І толькі потым слухачы даведаліся, што тэкст гэтай песні напісаў беларускі паэт Адам Русак. Так нарадзілася песня, а разам з ёю і новы беларускі паэт-песеннік.

А асновай амаль усёй яго вершаванай творчасці з'яўляецца народная песенная культура, і таму песні А. Русака так хутка падхоплівае народ. Яскравым сведчаннем гэтаму можа служыць яшчэ адзін твор на словы паэта — «Лясная песня» У. Алоўнікава, якая таксама набыла ўсенароднае прызнанне. Цяжка пералічыць усе вершы А. Русака, пакладзеныя беларускімі кампазітарамі на музыку — іх больш за паўтары сотні.

Аднак было б няправільным лічыць Русака толькі паэтам-песеннікам: на яго вершы пішуцца і буйныя музычныя творы. Так, у 1952 годзе паявілася кантата Д. Камінскага «Зямля расцвітае» для салістаў, хору і аркестра на словы вершаў паэта, а праз некалькі год—кантата І. Кузняцова для беларускага народнага хору і аркестра «Нёманскі край».

У дадзены зборнік увайшлі выбраныя песні на словы А. Русака для сольнага і харавога спявання пад акампанемент баяна ці фартэпіяна, якія змогуць узбагаціць як рэпертуар выканаўцаў-прафесіяналаў, так і іх калег з мастацкай самадзейнасці.

© Выдавецтва «Беларусь», 1975

783.2
П 28

П $\frac{90307\text{-}202}{М\ 301(05)\text{-}75}$ 173-75

БН 836



# УЗНЯЛОСЯ СОНЦА ЯСНАЕ

*Музыка Д. Лукаса*




БН 836
Дзяржаўная бібліятэка БССР імя У. І. Леніна


воль_ ны_ я над шы_ ро_ кі_ мі пра_ сто_ ра_
_мі, а_ свя_ ці_ ла да_ лі
ff
воль_ ны_ я над шы_ ро_ кі_ мі пра_ сто_ ра_
1-5.
6.
_мі. //_ю.

## Узнялося сонца яснае

Узнялося сонца яснае
Над палямі, над азёрамі,
Асвяціла далі вольныя
Над шырокімі прасторамі.

З трох старон па трох дарожаньках
Выйшлі людзі светлай раніцай
На Дрысвяцкае на возера
Будаваць электрастанцыю.

Закіпела праца дружная,
Дзе палеткі залацістыя,
Зашумелі, закружыліся
У турбінах воды быстрыя.

І у хатах светлай радасцю
Ясна зоры засвяціліся,
Да Масквы з падзякай шчыраю
Дружна песня пакацілася.

Пралятае песня птушкаю,
Пралятае над старонкаю,
Беларусь, Літву і Латвію
Акрыляе славай звонкаю.

Праслаўляе працу дружную,
Працу мірную, свабодную,
Сілу іх усемагутную,
Дружбу іх усенародную.

# МОЙ КРАЙ

*Музыка Я. Ціхановіча*

ПАВОЛЬНА




гай, а по_ле_во_ кам не аб_ няць, і гэ_та
ўсё — мой край, а по_ле_во_ кам
не аб_ няць, і гэ_та ўсё — мой
1,2.
3.
край. С. Жы_ве, пра_ // край.

## Мой край

Куды ні йду — лясы шумяць,
Цвіце за полем гай,
А поле — вокам не абняць,
І гэта ўсё — мой край.
} 2 разы

Жыве, працуе мой народ
Ці ў снежань, ці у май.
І багацее з году ў год
Мой родны, вольны край.
} 2 разы

Куды ні йду — лясы шумяць,
За полем рэчка, гай,
А ў сэрцы песень не стрымаць
Пра мой любімы край.
} 2 разы

# ПРЫЙДЗІ, МОЙ ЛЮБЫ

*Музыка А. Туранкова*







це_мен_ню ля_соў, прый_дзі, мой лю_бы, на пра_стор над_
_ве ду_ша ма_я, дзе за ра_кой га_ра від_на, там
_бой па_між кус_тоў, каб там, над ці_ха_ю ра_кой, па_


_нё_ман_скіх па_лёў. Прый_дзі ты ран_ня_ю па_рой, свой
лю_ба_я тва_я. Як зой_дзе сон_ца за ля_сы, за
_слу_хаць са_лаў_ёў. І за_га_рыц_ца мно_га зор над


дар ад_дай зям_лі, каб пад вя_ сен_ ня_ю за_рой ка_ лос_ сі
шы_ры_ню ні_ зін, у час вя_ чэр_ ня_е кра_сы су_ пы_ нім
це_мен_ню ля_ соў, прый_дзі, мой лю_ бы, на прас_тор над_ нё_ ман_
1,2.
рас_ цві_ лі.
гул ма_ шын.
каб пад вя_ сен_ ня_ю за_ рой ка_ лос_ сі
У час вя_ чэр_ ня_е кра_ сы су_ пы_ нім
каб пад вя_ сен_ ня_ю за_ рой ка_ лос_ сі
У час вя_ чэр_ ня_е кра_ сы су_ пы_ нім


3.
2.Ця_бе за_ //_скіх па_ лёў.
3. І прой_дзем
mf
рас_ цві_ лі.
гул ма_ шын.
прый_дзі, мой лю_ бы,
рас_ цві_ лі.
гул ма_шын.
прый_дзі, мой лю_ бы,
rit.
f
mp
А...
А...
на прас_ тор над_ нё_ ман_ скіх па_ лёў,
па_ лёў.
на прас_ тор над_нё_ ман_ скіх па_ лёў, па_ лёў.

# ДЗЕ ТЫ, ЗОРКА МАЯ?

*Музыка І. Лучанка*




mf
Дзе ты, ра – дасць ма – я за – ла – ці – ста – я,
на я – кой ты сця – жын – цы згу – бі – ла – ся?
mp
Дзе ты?
p
rit.

### Дзе ты, зорка мая?

Дзе ты, зорка мая
прамяністая?
За якія ты хмары скацілася?
Дзе ты, радасць мая
залацістая,
На якой ты сцяжынцы
згубілася?
Я шукаю цябе, углядаюся
У нябесныя далі высокія.
Без цябе мне дарога
не ясная,
Што ляжыць у прасторы
далёкія.
Дзе ты, зорка мая
непагасная?
За якімі схавана аблокамі?
Узыдзі, засвяці, зорка ясная,
Шчасцем сэрцу майму
адзінокаму.

# СТАЯЦЬ НАД НЁМАНАМ ДУБЫ

*Музыка І. Лучанка*

УМЕРАНА, ВЫРАЗНА




_ яць над Нё _ ма_нам ду_ бы, а_ сіл_ кі- во _ ла_ ты ста_яць, ня_
_ ма на све_це сі_лы той, каб іх спа_ліць, каб іх зла_маць. Рас_
_ туць сы_ны- ба_ га_ ты_ ры, п'юць со_ кі нё _ ман_ скіх кры_ ніц, і




*Вакаліз (фальцэтам) выконваецца па жаданню.


А...
mp
А на ру_ках сва_іх ду_бы ка_
_лы_шуць ю _ ных бус_ля_нят.
cresc.
sff

## Стаяць над Нёманам дубы

Стаяць над Нёманам дубы,
Асілкі — волаты стаяць,
Няма на свеце сілы той,
Каб іх спаліць, каб іх зламаць.

Растуць сыны — багатыры,
П'юць сокі нёманскіх крыніц,
І разбіваюцца аб іх
Маланкі грозных навальніц.

Зімой і летам, дзень і ноч
Дубы вартуюць родны край,
Над імі лётаюць буслы,
А каля іх квітнее гай.

А як збярэцца карагод,
Узыдзе месяц над ракой,
І песню слухаюць дубы
Вячэрняй ціхаю парой.

Стаяць над Нёманам дубы,
Асілкі — волаты стаяць,
Няма на свеце сілы той,
Каб іх спаліць, каб іх зламаць.

Вясна расквеціла сады,
І шэпча вяз каля прысад,
А на руках сваіх дубы } 2 разы
Калышуць юных буслянят. }

# ЛЯСНАЯ ПЕСНЯ

*Музыка У. Алоўнікава*




Дзяржаўная бібліятэка БССР імя У. І. Леніна


mf
сэр– цам па– чу– ю ва́– шу пес– ню ляс–
–ну– ю, ды ус– пом– ню бы– лы– я га–
Для паўтарэння
–ды. Ды ус–
p


Для заканчэння
f
//-быць. Ой, бя- ро- зы ды сос- ны - пар- ты-
-зан- скі - я сёс- тры, вас ні - ко- лі ў жыц-
-ці не за- быць...
f
p

## Лясная песня

Ой, бярозы ды сосны —
Мае родныя сёстры,
Ой, шумлівы ты, лес малады.
Толькі сэрцам пачую
Вашу песню лясную,
Ды успомню былыя гады.
Ды успомню пажары,
І варожыя хмары,
І завеі халодных снягоў,
І слату, і нягоды,
І начныя паходы,
І агні партызанскіх кастроў.
Край любімы мой, родны,
Ты на свеце свабодны,
За цябе я на бітву хадзіў,
Каб ніколі, ніколі
Ты не быў у няволі,
Каб чырвонымі кветкамі цвіў.
Адышлі тыя годы,
Адгрымелі паходы,
Толькі пушча за полем шуміць.
Ой, бярозы ды сосны —
Партызанскія сёстры,
Вас ніколі ў жыцці не забыць...

# САЛІГОРСКАЯ РАНІЦА

*Музыка У. Алоўнікава*




сос – ны ў ран – няй ці – шы – ні. Шах –
Б 7 7
М
–цё – ры а – пус – ка – юц – ца у нет – ры, ім
mf
Б Б Б
ПРЫПЕЎ:
яр – ка за – свя – ці – лі – ся аг – ні. Лю – бі – мы
М М М


край, ля_сы гус_ ты_ я, цві_туць лу_
лю_бі_мы край,
f 7 7 7 7
М
_гі, ка_ло_сяц_ца па_лі, і
цві_туць лу_гі, ка_ло_сяц_ца_па_лі,
7 7 7 7
М
кла_ня_юц_ца ні_ вы, ні_вы за_ла_ты_ я шах_
кла_ ня_ юц_ ца
Б
М


1.2.
3.
_це_рам са_лі_гор_скім да зям_лі.
Ні_
лі.
Б
І кла_ня_юц_ца ні_ вы,
ні_вы за_ла_ты_ я шах_
f
Б
pp
М
_це_рам са_лігор_скім да зям_лі.
p
mf
Б
rit.
Б
p

## Салігорская раніца

Павеялі ў пасёлку ціха ветры,
Калышуць сосны ў ранняй цішыні.
Шахцёры апускаюцца у нетры,
Ім ярка засвяціліся агні.

Прыпеў: Любімы край, лясы густыя,
Цвітуць лугі, калосяцца палі,
І кланяюцца нівы, нівы залатыя
Шахцёрам салігорскім да зямлі.

Ніколі не пагаснуць нашы зоры,
Свае дары аддасць нам глыбіня.
Навекі пакарылася шахцёрам
Ты — наша беларуская зямля.

Прыпеў.

Яснеюць за капрамі далягляды,
Дарогі ўдалеч новыя завуць.
Ідуць камуністычныя брыгады,
Шахцёры салігорскія ідуць.

Прыпеў.

# СУСЕДКА

*Музыка І. Кузняцова*




2. Я ка_
4. Гэ_та ж
сэр_ца рас_та_ е, а ён ей не ра_ды, ох! Ля, ля
_ходзь ка мне на мёд, на блі_ ны, а_лад_кі, ох!
ля і г.д.
_жу ей: _ Не пус_кай ты ку_ рэй у шко_ду... Ох! А я_
трэ_ба мне цяр_ пець гэ_та_ кі_я здзе_кі... На блі_
_на мне: _ Не шка_ дуй свай_го а_ га_ ро_ ду.
_ны зай_шоў я раз і пра_ паў на_ ве_кі.
А су_
На блі_
1.
3. Рас_ кі_
_сед_ка: _ Не шка_ дуй свай_го а_га_ро_ду, ох! Ля, ля
_ны зай_ шоў ён раз і пра_ паў на_ве_кі.
ля і г.д.

## Суседка

Ой, суседка ж у мяне,
Дайце ж, людзі, рады...
Глянеш — сэрца растае,
А я ж ёй не рады.
Глянеш — сэрца растае,
А ён ёй не рады, ох!

Я кажу ёй: — Не пускай
Ты курэй у шкоду...
А яна мне: — Не шкадуй
Свайго агароду.
А суседка: — Не шкадуй
Свайго агароду, ох!

Раскідай ты гэты плот,
Цэлы будуць градкі,
І прыходзь ка мне на мёд,
На бліны, аладкі...
І прыходзь ка мне на мёд,
На бліны, аладкі, ох!

Гэта ж трэба мне цярпець
Гэтакія здзекі...
На бліны зайшоў я раз
І прапаў навекі.
На бліны зайшоў ён раз
І прапаў навекі, ох!

Я раскідаў гэты плот
Для маёй суседкі,
З той часіны кожны год
Калышу я дзеткі.
З той часіны кожны год
Ён калыша дзеткі.

# ДНЯПРО

*Музыка Ю. Семянякі*




на _ шай квя_ціс_ тай Ра _ дзі_ мы, пес _ ня на_ шых шы_
_ро _ кіх па _ леў.
Над та_бой раз_га _ ра_ юц_ца
Над та_бой раз_ га_ра_ юц_ ца
зо _ ры,
над та_ бо _ ю са _ ды рас_ цві_
зо _ ры, над та_ бо_ ю са_ ды рас_ цві_


лі, ты ня_ сеш на_ шы ду_ мы ў прас_
_лі, рас_ цві_ лі, ты ня_ сеш на_ шы ду_ мы ў прас_
_то_ ры,
_ры, спе_ вы звон_ кі_ я род_ най зям_
_то_
1,2.
_лі.
3.
// _ёй.

## Дняпро

Ой, Дняпро ты наш родны,
любімы,—
Казка нашых шумлівых лясоў,
Слава нашай квяцістай
Радзімы,
Песня нашых шырокіх палёў.
Над табой загараюцца зоры,
Над табою сады расцвілі,
Ты нясеш нашы думы ў
прасторы,
Спевы звонкія роднай зямлі.
Не адну ты зложыў нам быліну
Пра адважных сыноў пра сваіх,
Што тапілі варожую сілу
У кіпучых у хвалях тваіх.
Не кружыцца тут воранам
чорным,
І вады ім тваёй тут не піць,
Над тваёю над кручаю горнай
Ім агнёў залатых не згасіць.
Ой, Дняпро ты наш родны,
любімы,—
Казка нашых шумлівых лясоў,
Слава нашай квяцістай
Радзімы,
Песня нашых шырокіх палёў.
І выходзім мы ранняй парою
На шырокі палетак на твой,
Загараецца дзень над табою
З новай песняй і славай тваёй.

# ЦІХІ ВЕЧАР

*Музыка Г. Вагнера*

УМЕРАНА






## Ціхі вечар

Ціхі вечар у сузор'і
Над сялом плыве,
Засвяціліся агнямі
Росы на траве.
Да цябе не сам прыйшоў я,—
Сэрца прывяло,
А свайму я сэрцу веру,—
Шчасце тут знайшло.

Не пытайся аб каханні,
Бо не адкажу,
Толькі знаю, што адзін я
Без цябе тужу.

Толькі знаю, што з табою
Радасць я пазнаў,
Хіба ж вінен я у гэтым,
Што цябе спаткаў.

Заўтра зноў насустрач сонцу
Выйдзем у палі,
Дзе красою веснавою
Нівы расцвілі.
А сягоння ціхі месяц
Выплыў за сяло...
Да цябе не сам прыйшоў я,—
Сэрца прывяло.

# ЧЫРВОНАЯ ВЯРГІНЕЧКА

*Музыка Н. Сакалоўскага*




_ей, ой, ё_ ей, што зра_ бі_ ла ты са
мной, ой, ё_ ей, ой, ё_ ей, што зра_
_бі_ ла ты са мной?
1–3.
4.
_чу.

## Чырвоная вяргінечка

Чырвоная вяргінечка —
Прыгожая дзяўчыначка,
Ой, ё-ёй, ой, ё-ёй,
Што зрабіла ты са мной? } 2 разы

Калі дзень цябе не бачу,
Нібы цэлы свет я трачу,
Ой, ё-ёй, ой, ё-ёй,
Што зрабіла ты са мной? } 2 разы

А ні ўдзень, а ні ўночы
Не заплюшчваюцца вочы,
Ой, ё-ёй, ой, ё-ёй,
Што зрабіла ты са мной? } 2 разы

А ці любіш, ці не любіш,
Толькі сэрца маё губіш,
Ой, ё-ёй, ой, ё-ёй,
Што зрабіла ты са мной? } 2 разы

# ТОЛЬКІ З ТАБОЮ

*Музыка І. Любана*

УМЕРАНА ХУТКА






**Толькі з табою**

Толькі з табою мне хочацца быць,
Толькі з табою.
Радасць, і гора, і шчасце дзяліць
Толькі з табою.

Ранняй часінай к табе я лячу,
Позняй парою.
Толькі к табе прыхіліцца хачу
Сэрцам, душою.

Выйсці ў поле, дзе нівы шумяць
Там, над ракою,
Першую зорку на небе спаткаць
Толькі з табою.

Гэтак не страшны цяжкія пуці
Будуць з табою,
Гэтак ісці неразлучна ў жыцці
Толькі з табою.

# НЕ ШУКАЙ

*Музыка І. Любана*




жыт_ніх па_лёў, не шу_кай, не шу_кай,
ка_лі к сэр_цу май_му ты да_рог не знай_шоў, ты да_
ten.
rit.
_рог не знай_шоў, ты да_рог не знай_шоў, не шу_кай, не шу_




## Не шукай

Не шукай ты мяне
Каля жытніх палёў,
Не шукай,
Калі к сэрцу майму
Ты дарог не знайшоў,
Не шукай...

Не кажы ты мне слоў,
Што не грэюць цяплом,
Не кажы,
Калі сэрца тваё
Не палае агнём,
Не кажы...

Не спявай пад акном
Ты мне песні сваёй,
Не спявай,
Калі ў сэрцы не я
Буду песняй тваёй,
Не спявай...

Не шукай ты мяне
У цішы вечароў,
Не шукай,
Калі к сэрцу майму
Ты дарог не знайшоў,
Не шукай...

# ВЯСЕЛЬНАЯ ЗАСТОЛЬНАЯ

*Музыка І. Кузняцова*




**Вясельная застольная**

Ой, не п'ецца гарэлка,
Ой, не п'ецца віно.
Хто ж налье таго мёду,
Каб салодка было?

Паміж нас маладыя
За вясельным сталом,
Павянчалася шчасце
Іх пад шлюбным вянком.

Ґорка, горка гарэлка
За вясельнай гульбой,
Падсалодзяць нам чаркі
Малады з маладой.

Падсалодзяць тым шчасцем,
Што два сэрцы зліло,
Каб вясёлым, мядовым
Век жыццё іх было.

# БЫВАЙЦЕ ЗДАРОВЫ

*Музыка І. Любана*

УМЕРАНА ХУТКА






**Бывайце здаровы**

Бывайце здаровы,
Жывіце багата,
Ужо ж мы паедзем
Дадому, дахаты.
Ў зялёнай дуброве
Мы начаваць будзем.
Эх! Вашае ласкі
Вавек не забудзем.

У вашым калгасе
Шырокае поле,
Няхай жа для шчасця
Цвіце ваша доля.
Хай кожны з вас будзе
Здаровы, дзябёлы,
Хлявы былі б поўны
Усякай жывёлы.

Каб жыта у полі
Трубою вілося,
А ў хаце каб сала
Кублямі вялося.
Штодзень у капусце
Каб плавала скварка,
А к ёй, калі трэба,
Знайшлася б і чарка.

Каб дружнай работаю
Вашай брыгады
Усе ганарыліся,
Ўсе былі рады.
Жадаем яшчэ вам
Прыбытку у хаце,
Ні мала, ні многа,—
Штогод па дзіцяці.

Не будзе вам крыўды
Яшчэ і за тое,
Калі пашанцуе
На год і па двое.
Бывайце здаровы,
Жывіце багата,
А мы ад'язджаем
Дадому, дахаты.

Дзяржаўная
бібліятэка
БССР
імя У. І. Леніна

## ЗМЕСТ


Узнялося сонца яснае. Музыка Д. Лукаса . . . . . . . . 1
Мой край. Музыка Я. Ціхановіча . . . . . . . . 4
Прыйдзі, мой любы. Музыка А. Туранкова . . . . . . . 7
Дзе ты, зорка мая? Музыка І. Лучанка . . . . . . . 11
Стаяць над Нёманам дубы. Музыка І. Лучанка . . . . . . 14
Лясная песня. Музыка У. Алоўнікава . . . . . . . . 19
Салігорская раніца. Музыка У. Алоўнікава . . . . . . . 23
Суседка. Музыка І. Кузняцова . . . . . . . . . 28
Дняпро. Музыка Ю. Семянякі . . . . . . . . . 31
Ціхі вечар. Музыка Г. Вагнера . . . . . . . . . 35
Чырвоная вяргінечка. Музыка Н. Сакалоўскага . . . . . . . 37
Толькі з табою. Музыка І. Любана . . . . . . . . 40
Не шукай. Музыка І. Любана . . . . . . . . . 42
Вясельная застольная. Музыка І. Кузняцова . . . . . . . 45
Бывайце здаровы. Музыка І. Любана . . . . . . . . 46



На белорусском языке

ПЕСНИ НА СЛОВА А. РУСАКА

Рэдактар Д. М. Жураўлёў. Мастак Н. В. Стас. Мастацкі рэдактар В. П. Бязмен. Тэхнічны рэдактар М. І. Грыневіч. Карэктар І. М. Пупко. Здадзена ў набор 19/III 1975 г. Падп. да друку 9/VII 1975 г. Тыраж 8800 экз. Фармат $70 \times 90^1/_{16}$. Папера друк. № 1. Ум. друк. арк. 3,51. Ул.-выд. арк. 3,3. Зак. 177. Цана 34 кап.

Выдавецтва «Беларусь» Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў Беларускай ССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Мінск, Ленінскі праспект, 79.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Мінск, Ленінскі праспект, 79.

34 к.

Індэкс 74927

B0000002304575

